**Буднік В.В.**

# ЭТНАРЭЛІГІЙНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ЎСХОДНЕПАЛЕССКАГА РЭГІЁНА)

Гістарычнымі ўмовамі ўсходнеславянскія народы апынуліся ў цесных узаемасувязях і добрых суседскіх адносінах. Асабліва плённае ўзаемадзеянне рускіх, украінцаў і беларусаў у розных сферах жыцця – гаспадарча-эканамічнай, культурнай, канфесійнай і этнічнай, назіраецца на памежнай тэрыторыі. Ва ўмовах глабалізацыі і мадэрнізацыйных працэсаў, якія адбываюцца ва ўсіх сферах жыцця грамадства, асаблівую актуальнасць набывае вывучэнне памежных тэрыторый. Усходнепалескі рэгіён, які ўключае практычна ўсю тэрыторыю Гомельскай вобласці, прадстаўляе асаблівую значнасць з пункту гледжання этнаканфесійнага ўзаемадзеяння.

Актуальнасць этнарэлігійнага даследавання усходнепалесскага рэгіёна звязана з тым безумоўным фактам, што рэлігійныя традыцыі з’яўляюцца важным фактарам у развіцці грамадства. Узаемадзеянне усходнеславянскіх народаў у значнай ступені вызначае не толькі эканамічную і палітычную сітуацыю, але і сацыякультурны, этнарэлігійны стан рэгіёна сёння і ў мінулым.

Мэта работы з’яўляецца характарыстыка на прыкладзе найбольш распаўсюджаных канфесій Гомельшчыны ўзаемадзеяння суб’ектаў усходнепалесскага рэгіёна ў рэлігійнай сферы як адну з формаў сацыякультурнай камунікацыі ў мінулым і ў наш час.

Заглянуўшы ў мінулае славянскіх народаў, зразумелым становіцца тое, што кантакты паміж прадстаўнікамі канфесій назіраліся напрацягу гісторыі і незалежна ад дзяржаўных межаў. Было шмат агульнага і адрознага. Калі звярнуцца да найбольш старажытнай рэлігіі славян, то язычніцтва (або пагантсва) на тэрыторыі Мазырска-Прыпяцкага Палесся не адрознівалася ад вераванняў суседніх славянскіх народаў [8, с. 149].

У наш час найбольш за ўсё ва Усходнім Палессі прадстаўлены такія канфесіі, як праваслаўе, пратэстантызм. Некалькі плыняў пратэстанцкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сектанцтва узнікае ў другой палове XIX ст. У канцы 70-х гг. у Гомельскім павеце былі выяўлены прыхільнікі штундызму, які быў занесены сюды з паўднёвых раёнаў Расійскай імперыі, куды жыхары павета адпраўляліся на заробкі. З суседніх украінскіх губерній сяляне прыносілі не толькі заробленыя грошы, але і новыя рэлігійныя павевы. У 80-я гг. штундысты з'явіліся ў Рагачоўскім павеце Магілёўскай губерні і іншых месцах [2, с. 105]. У 1907 г. у вёску Хальч Гомельскага павета з заробкаў вяртаюцца браты Прыходзька Навум Барысавіч і Самсон Барысавіч і ствараюць так баптысцкую абшчыну. Напрацягу ўсёй гісторыі свайго існавання баптысты Гомельшчыны падтрымліваюць цесную сувязь са сваімі братамі па веры ў Хрыста з Чарнігаўскай і Бранскай абласцей. Ажыццяўляюць сумесныя набажэнствы, мерапрыемствы з удзелам моладзі, што знаходзіць адлюстраванне на старонках органа перыядычнага друку Саюза ЕХБ Беларусі – часопісе "Крыніца жыцця".

Адметным з'яўляецца і тое, што працэс узаемадзеяння назіраўся і на ўзроўні народных вераванняў, забабонаў. Так, архіўныя матэрыялы 1920-х гг. зафіксавалі наступны цікавы факт: "… Сектантское движение в губернии не обнаруживает в последний период тенденции к дальнейшему росту и вкрапливается в деревню почти по всей губернии, помимо этого по губернии имеются случаи появления различных чудес, как например, история со священными хлебами, перенесена сюда из Украины, имеет довольно большое распространение в деревне" [3, арк. 35].

Гомельшчына з'яўляецца своеасаблівым цэнтрам стараверства, якое ўзнікла ў выніку царкоўнага расколу сярэдзіны XVII ст. Так, значная колькасць прыхільнікаў гэтага накірунку праваслаўя знайшлі прытулак на тэрыторыі Гомельскай вобласці, заснаваўшы слабаду Ветка. Аднак, на гэтым іх прыгоды не закончыліся. Царскі ўрад накіроўваў усю моц на ліквідацыю стараверскіх анклаваў, арганізоўваў так званыя выганкі. Крыніцы адзначаюць цікавы факт - калі адбываліся выганкі Веткі, большая частка стараавераў знаходзіла прытулак у Старадубскіх слабодах раскольнікаў, што ў сваю чаргу павялічвала насельніцтва Клімалавай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слабады. Такі працэс, напрыклад, назіраўся ў 1740-м і 1763 гг. Зразумеўшы, што яшчэ раз аднавіцца не атрымаецца, веткаўскія стараверы вывезлі ў Клімава сваю святыню Пакроўскую царкву. А разам з ёй у Клімава быў пераненсены цэнтр усяго паўднёва-заходняга стараверства [7, с. 32].

У наш час ва Усходнім Палессі, як у цэлым у Беларусі, на фоне поліканфесійнай разнастайнасці дамінуюць праваслаўныя традыцыі. Найбольш плённыя камунікатыўныя працэсы назіраюцца менавіта паміж праваслаўнымі вернікамі. Пры гэтым неабходна адзначыць, што сацыякультурная камунікацыя адбываецца як на дзяржаўным узроўні (дамовы, пагадненні ў межах Саюзнай дзяржавы), так і на ўзроўні міжасобасных зносін (кантакты паміж асобнымі вернікамі, паломніцкія вандроўкі). Ужо традыцыйнай стала прысутнасць праваслаўнага духавенства на міжнародным фестывалі славянскіх народаў “Славянскае адзінства”, што ладзіцца штогод у апошні тыдзень чэрвеня каля Манумента Дружбы на памежжы Беларусі, Украіны і Расіі. Так, у лістападзе 2010 г. на гэтым гістарычным месцы адбылася сустрэча іерархаў Рускай Праваслаўнай Царквы – мітрапаліта Валакаламскага Іларыёна, архіепіскапа Чарнігаўскага і Ноўгарад-Северскага Амвросія, епіскапа Бранскага і Сеўскага Феафілакта і епіскапа Рэчыцкага Леаніда, вікарыя Гомельскай епархіі. Каля паклоннага крыжа мітрапаліт Іларыён здзейсніў малебен аб благадзенстваіі трох брацкіх народаў [6].

25 чэрвеня 2011 г. Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсей Русі Кірыл ўдзельнічаў у адкрыцці Міжнароднага фестываля славянскіх народаў “Славянскае адзінства-2011”. У сваёй прамове кіраўнік Рускай Праваслаўнай царквы зазначыў, што неабходна паглыбіць супрацоўніцтва паміж памежнымі рэгіёнамі Расіі, Украіны і Беларусі. На яго думку, перспектыўнымі накірункамі гэтага супрацоўніцтва могуць з’явіцца правядзенне сумесных набажэнстваў, развіццё паломніцтва, прынясенне святынь, арганізацыя культурных і грамадскіх акцый з удзелам моладзі. Менавіта гэтыя прапановы былі зафіксаваны ў плане мерапрыемстваў па супрацоўніцтву Чарнігаўскай вобласці Украіны, Бранскай вобласці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Расійскай Федэрацыі і Гомельскай вобласці Рэспублікі Беларусь у межах Памежнай Супольнасці "Еўрарэгіён "Днепр" на 2012-2013 гг. (у прыватнасці, такі пункт, як садзейнічанне рэлігійным арганізацыям розных канфесій ў арганізацыі і правядзенні паломніцкіх і місіянерскіх вандровак вернікаў) [5].

Важнай складаючай і адначасова формай этнарэлігійнага ўзаемадзеяння веруючых з'яўляецца рэлігійнае паломніцтва. Так, жыхароў Кармы цяжка здзівіць колькасцю веруючых і паломнікаў, якія рэгулярна наведваюць храм святога праведнага Іаана Кармянскага. Вельмі шмат паломнікаў наведваюць храм у царкоўныя святы. Паломніцтва дазваляе веруючым дакрануцца да той ці іншай праваслаўнай святыні. Яно зблiжае людзей, умацоўвае іх душы і сэрцы, дазваляе адкрыць для сябе новыя храмы і святыя месцы. Аднак, усяношнае набажэнства ў дзень памяці святога праведнага збірае іх неверагодную колькасць. Беларускія, украінскія і расійскія грамадзяне, падзеляныя дзяржаўнымі межамі, але аб'яднаныя верай, прымаюць ўдзел у правядзені набажэнства. [1, с. 1]. Адным з прыкладаў паломніцкай дзейнасці з'яўляецца таксама наведванне Свята-Мікалаеўскага мужчынскага манастыра і Свята-Іаанаўска-Кармянскую жаночую абіцель інвалідамі па зроку Бранскай рэгіянальнай грамадскай арганізацыі. Пад час наведвання вернікі мелі магчымасць не толькі памаліцца, але і даведацца аб гісторыі заснавання манастыроў, а таксама аб жыцці і дзейнасці святых беларускага Палесся [4].

Адзінства славян павінна грунтавацца не толькі на эканамічных сувязях, але і на аснове агульнасці культуры і духоўнасці. І менавіта адной з важнейшых функцый міжкультурнай камунікацыі ў сферы рэлігіі і духоўнасці з'яўляецца падтрыманне дынамічнага адзінства і цэласнасці усходнеславянскай сацыякультурнай прасторы.

Такім чынам, можна канстатаваць той факт, што працэсы сацыякультурнай камунікацыі ў рэлігійнай сферы паміж беларусамі, рускімі і ўкраінцамі на памежжы мелі месца быць як у гістарычным мінулым, так і ў наш час. Пры гэтым розніліся яны і па характару суб'ектаў камунікацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(міжгрупавая, міжасабовая), і па ўзроўні яе працякання (на дзяржаным узроўні праз дамоўленнасці і пастановы і на ўзроўні народных вераванняў).

---


1. Дубовский, Л. И стар и млад… / Леонид Дубовский // Добрушскі край. – 2012. – 6 чэрв. – С. 1, 5.

2. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII-XX ст.) / В. В. Грыгор’ва, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі. – Мінск : ВП “Экаперспектыва”, 1998. – 340 с.

3. Отчеты отдела о проделанной работе, проекты постановлений // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 2629.

4. Паломники из Брянска на Гомельщине [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: http://eparhiya.by/palomnichestvo/1338-palomniki-iz-bryanska-na-gomelschine.html. - Дата доступу: 18.04.2013.

5. План мероприятий по сотрудничеству Черниговской области Украины, Брянской области Российской Федерации и Гомельской области Республики Беларусь в рамках Приграничного Сообщества «Еврорегион «Днепр» на 2012-2013 годы [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу: http://www.econom.brk.ru/bank/deyatelnost/plan_2012_2013.doc. – Дата доступу : 25.04.2013.

6. Славянское единство-2011 [Электронны рэсурс] // Рэжым доступу : http://www.klsovremennik.ru/2011-04-07-14-46-12/2011-04-09-17-30-36/215-2011. – Дата доступу : 25.04.2013.

7. Смолянкин, Н. С. Старообрядцы. Историко-краеведческий очерк / Н.С. Смолянкин. – Климово : ООО “Издательство “Наяда”, 2006. – 96 с.

8. Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем / А. В. Гурко, И. В. Чавкин, Г. И. Касперович [и др.] ; НАН РБ, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы. – Минск : Беларус.я навука, 2010. – 466 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ